# ДОБРА І ВЕСЕЛА АДПАЧЫВАЙЦЕ

**(Гутарка менскіх піянераў са старшынёй СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДАМ).**

З'яюць чырвоныя гальштукі. Як дома, адчуваюць сябе піонеры ў зале Совета Народных Камісараў. Тут праходзіць іх гутарка з старшынёй Соўнаркома тав. **Н. М. Галадзедам** аб арганізацыі лагернаэ кампаніі. Прысутнічаюць наркомасветы тав. **Чарнушэвіч**, прадстаўнікі ЦК ЛКСМБ і гаркома комсамола.

Навучальны год падыходзіць да канца. Піонеры расказваюць тав. Галадзеду аб сваёй вучобе, піонерскай рабоце, арганізацыі іспытаў у сваіх школах. Тав. Галадзед цікавіцца ўсімі дэталямі школьнага і піонерскага жыцця: як выкладаецца **гісторыя і фізічная геаграфія, як сустрэлі новую пастанову ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб школе, як разгорнута спаборніцтва ў школах, як ажыццяўляецца новы беларускі правапіс.**

Пасля напружанай работы ў школе дзеці павінны разумна адпачыць, каб з новымі сіламі ўзяцца за вучобу. Адзін з асноўных форм адпачынку дзяцей—гэта выезд у лагер. Слаба была арганізавана лагерная кампанія ў мінулым годзе. Дзеці ўказваюць на рад недахопаў.

— **У мінулым годзе наш лагер быў у адным месцы, а цяпер у другім, — гаворыць піонерка Глайхенгауз (завод «Большэвік»). З гэтай прычыны трацяцца залішне многа грошай на абсталяванне. Мы просім урад прыняць меры, каб распачаць будаўніцтва стандартных лагерных гарадкоў.**

Піонерка **Блох** (друкарня імя Сталіна) расказвае, што яна нядаўна прыехала з Артэка (Крым) і што многа карыснага і цікавага з гэтай усесаюзнай здраўніцы трэба перанесці ў лагеры БССР.

Самы галоўны недахоп, на што больш усяго скардзяцца дзеці — гэта дрэнны падбор важатых і фізкультурных работнікаў для лагераў.

Кіраўнік піонерскай арганізацыі БССР тав. **Рутэнберг** знаёміць прысутных з падрыхтоўкай да лагернай кампаніі ў гэтым годзе. 20 тысяч піонераў і школьнікаў Беларусі будуць ахоплены 70 лагерамі (з іх 3. 600 дзяцей Менска). Значна лепш чым у мінулым годзе ідзе падбор месц для лагераў, якія павінны агледацца ўрачом, ці адпавядаюць усім патрабаванням для адпачынку і аздараўлення дзіцячага арганізма. Без заключэння ўрача ніводзін раён не мае права вывазіць дзяцей у лагер.

У кожным раёне арганізован семінарый для важатых, якія будуць працаваць у лагеры. Таксама рыхтуюцца кадры важатых. для работы з дзецьмі, якія застаюцца ў горадзе.

З вялікім задавальненнем і цікавасцю дзеці слухаюць **Нікалая Матвеевіча** аб галоўных умовах добрай арганізацыі лагернай работы і здаровага, разумнага адпачынку.

— Арганізацыя лагернага дня, рэжым лагера,—гаворыць тав. Галадзед,—гэта рашаючыя пытанні. Сюды ўваходзіць усё жыццё лагера: і быт, і дысцыпліна, і пытанне чысціты, акуратнасці, самадзейнасці, культурных адносін да людзей.

Гэта пытанне асабліва адносіцца да комсамола, які павінен правільна арганізаваць адпачынак дзяцей. **Трэба, каб начальнік лагера прадумаў кожную мінуту дня, усё жыццё лагера да драбнейшай дэталі.**

У лагеры зусім новая абстаноўка.. Піонеры пераключаюцца на агульнае жыццё. Тут могуць сустрэцца дзеці з рознымі нахільнасцямі, з розным выхаваннем. Лагер —сродак вылечвання асобных адмоўных бакоў некаторых піонераў. **Лагер павінен з'явіцца лепшым багульнажыццём, дзе-б элементы лепшых выхаваных вучняў пераймаглі і прывіваліся усім лагернікам.**

**Дысцыпліна і арганізаванасць павінна праяўляцца ва ўсім лагерным жыцці.**

Не менш важнае пытанне ў лагеры набываюць **беражлівыя адносіны да лагернай маёмасці.** Памяшканне трэба трымаць у чыстаце, абсталяванне не псаваць, глядзець, каб нічога ў лагеры не прападала, каб ніводная чашка не была паламана. **Піонеры павінны ўступіць у спаборніцтва на лепшыя беражлівыя адносіны да лагерней маемасці.**

У заключэнні тав. Галадзед выказвае сваё пажаданне піонерам-лагернікам:

**— Едзьце ў лагеры, добра адпачывайце, беражыце грамадскае дабро, замацоўвайце сваё здароўе. І я буду вельмі рад, калі пасля лагераў прыйдзеце да мяне і скажаце:**

**— Тав. Галадзед, усё ў парадку.**

**Ф. Фельдман.**